ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З КРАСАВІКА 1955 ГОДА ● № 15 (3627) ● ПЯТНІЦА, 14 ЖНІЎНЯ, 2020

ВЫДАННЕ “ГОЛАС РАДЗІМЫ” ЧЫТАЙЦЕ Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА ПАРТАЛЕ ZVIAZDA.BY

Хлеб у хаце гаспадар
Стар. 3

Паўстагоддзя ў адкрытым моры
Стар. 4

100 карцін і 30 гравюр у падарунак Радзіме
Стар. 7

СВЕТАПОГЛЯД

Хай брат не пакрыўдзіць брата!

У Беларусі прайшлі выбары Прэзідэнта. На жаль, выбарчая кампанія ў краіне тым не закончылася...

БЕЛТА

Сям'я на выбарчым участку ў Наваполацку

У краіне 9 жніўня прайшлі выбары. Наступным днём Цэнтрвыбаркам абвясціў папярэднія іх вынікі. На БелТА з’явілася інфармацыя: у дзейнага Кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі 80,23% галасоў. Паводле папярэдніх дадзеных, як паведамлялася, за Святлану Ціханоўскую прагаласавалі 9,9%, за Ганну Канапацкую — 1,68%, Андрэя Дзмітрыева — 1,04%, Сяргея Чэрачня — 1,13%, супраць усіх — 6,02%.

Адметнасць сёлетніх выбараў была ўжо ў тым, што, знаёмячы журналістаў з іх папярэднімі вынікамі, старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына казала наступнае: “Яны літаральна атрымліваліся ў ручным рэжыме ў сілу таго, што Цэнтральная камісія, па меншай меры, я з аналітыкам, нас было толькі двое, у гадзіну ночы былі эвакуяваныя з Дома ўрада. Таму мы не прымалі вынікі. Мы прынялі іх толькі цяпер, літаральна напярэдадні гэтага брыфінгу”.

Эвакуацыя ЦВК? Такога ў нас яшчэ не бывала. Падобная інфармацыя насцярожвала. Тым больш, што з’яўляліся весткі ў інтэрнэце, прайшлі чуткі: незадаволеныя вынікамі галасавання грамадзяне ўжо ў ноч з 9 на 10 жніўня выйшлі на вуліцы, патрабавалі “честных” выбараў, абвінавачвалі ўлады ў махінацыях з выбарчымі бюлетэнямі. Пазней з інфармацыі, якую давёў Следчы камітэт, стала вядома: там сапраўды “працягваецца расследаванне крымінальных спраў аб масавых беспарадках і гвалце ў дачыненні да супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, якія адбыліся 9 жніўня ў Мінску”. Распачата 21 крымінальная справа. Прычым “паводле дадзеных следства, масавыя беспарадкі ў краіне адбываліся не спантанна: каардынавалі дзеянні грамадзян і кіравалі імі спецыяльна падрыхтаваныя асобы. У ходзе вывучэння запісаў камер відэаназірання следчыя прыйшлі да высновы, што каардынатары прафесійна арганізоўвалі натоўп і заклікалі грамадзян да актыўных дзеянняў”. Паведамляецца, што ў натоўпе былі правакатары, якія падбухторвалі ўдзельнікаў да гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, правакуючы такім чынам прыняцце сілавых мер. Самі ж падбухторшчыкі ў часе дзеянняў ад месцаў сутыкненняў грамадзян з супрацоўнікамі АМАП адыходзілі.

Ці абяцала нешта бяду ў нашым доме? Так. І сам Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка не раз публічна гаварыў, што сёлета краіну чакаюць вялікія выпрабаванні. Пра шэраг розных пандэмій, якіх налічвалася ці не з пяць. Безумоўна, каранавірус прыўнёс немалое эмацыйнае напружанне ў грамадства. Беларусь жа выбрала свой шлях у змаганні з пандэміяй, таму пачаліся атакі з розных бакоў на кіраўніцтва краіны. З часам, аднак, многія зразумелі: стратэгія й тактыка былі апраўданыя. Але “інфапандэмія” нарастала. Стабільнасць і спакой у грамадстве пачалі разбіваць розныя “дальнабойныя” фэйкі. Якія, вядома ж, абвяргаліся ў афіцыйных СМІ — але ж сляды ад іх застаюцца. Была разгорнута ў часе перадвыбарчай агітацыі “массированная” інфабарацьба супраць дзеючага Прэзідэнта, найперш у інтэрнэце. Фіксаваліся шматлікія парушэнні правапарадку ў ходзе збору подпісаў, перадвыбарчай агітацыі. Закруцілася крымінальная справа з “Белгазпромбанком”, былі затрыманы на тэрыторыі Беларусі людзі з расійскай прыватнай ваеннай кампаніі “Вагнер”, гаварылася пра гібрыдную вайну, якая вядзецца з замежжа супраць Беларусі…

Калі пішацца гэты тэкст, супрацьстаянне пратэстантаў і прадстаўнікоў сіл правапарадку прадаўжаецца. Нам жа, хто апелюе да розуму, а не эмоцый узбуджаных людзей, застаецца толькі як малітву паўтараць: хай брат не ідзе на брата! І спадзявацца, што ў гэтым канфлікце ўдасца, праявіўшы лепшыя рысы беларускага характару, вырашыць супярэчнасці не ў крывавых разборках — за сталом перагавораў.

Іван Ждановіч

75 ГАДОЎ ПЕРАМОГІ

У бой ідзе паэзія сыноў

З вёскі Руціцы Карэліцкага раёна Гродзеншчыны быў родам Фёдар Шугля: афіцэр-ардэнаносец, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Памяць пра бацьку-героя вызначае жыццёвыя арыенціры й для сына яго Уладзіміра: паэта, Ганаровага Генеральнага консула Беларусі ў Цюменьскай вобласці Расіі.

ISSN 0439-3619

Сёлета на пачатку чэрвеня ў Цюмені выйшла з друку кніга “И снова май, победный май” — зборнік цюменьскіх паэтаў, прысвечаны 75-годдзю Перамогі. Гэта вершы, паэтычныя абразкі больш чым 20 аўтараў. Як расказаў журналістам адзін з іх, Мікалай Зензін, важкім аргументам за тое, каб зборнік абавязкова выйшаў, сталі выказванні некаторых замежных палітыкаў і гісторыкаў на пачатку года. Яны гаварылі пра перамогу краін антыгітлераўскай кааліцыі над фашысцкай Германіяй, не называючы Савецкага Саюза! Дэпутаты Еўрапарламента палічылі: гэта два таталітарныя рэжымы для перадзелу свету й захопу чужых тэрыторый развязалі вайну. “Жаданне супрацьстаяць плыні такой хлусні й было адным з пабуджальных матываў аўтараў”,— адзначыў Мікалай Зензін.

Як бачым, эстафету подзвігу гераічных бацькоў, дзядоў годна нясуць сыны, унукі. У бой за гістарычную праўду ідзе іх паэзія. А на 4-ю старонку вокладкі 106-старонкавага зборніка (якую абдымае Сцяг Перамогі) вынесены чаканныя, бы з марша, радкі Мікалая Зензіна: “В боях с врагом Отчизну отстояли,/ И никому Победу не отнять! Историю мы кровью написали,/ И не дадим ее переписать!”.

З гордасцю за беларусаў Цюмені чыталі мы ў інтэрнэце, што творчую й матэрыяльную падтрымку пры падрыхтоўцы, выданні зборніка аказаў Уладзімір Шугля — кіраўнік Рэгіянальнай грамадскай арганізацыі “Саюз — інтэграцыя брацкіх народаў”, паэт, Ганаровы Генеральны консул Беларусі ў Цюменьскай вобласці Расіі. Ягоная прадмова пададзена ў зборніку, і вершы на ваенную тэму таксама.

Уладзімір Шугля

→ Стар. 5

ДЗЯРЖАВА І ТАЛЕНТЫ

Зноў будзе музыка гучаць

Грунтоўна падноўлены будынак Рэспубліканскай гімназіі-каледжа, што пры Акадэміі музыкі, атрымалі да новага навучальнага года яе шматлікія навучэнцы

Гэта здорава, што закончаны былі рэканструкцыя й рэстаўрацыя будынка яшчэ ў часе летніх вакацый: у кіраўніцтва ўстановы ёсць часу, каб пасля рамонту ўсё, як кажуць, расставіць на свае месцы. Цяпер гімназія-каледж стала больш прыстасаванай для заняткаў музыкай. З'явіліся прасторныя аўдыторыі, канцэртная зала на 300 месцаў і камерныя залы. Упершыню вялікая ўвага надавалася акустыцы залаў і гукаізаляцыі класаў. І юныя музыканты нарэшце займелі ўласную студыю гуказапісу! "Неабходнасць такой студыі даўно пацверджана часам, — казаў, калі наноў адкрывалася гімназія-каледж, яе дырэктар, вядомы піяніст, лаўрэат міжнародных конкурсаў Аляксандр Палякоў. — Цяпер мы зможам рабіць запісы, неабходныя не толькі для папаўнення агульнай калекцыі лепшых інтэрпрэтацый, але й для ўдзелу нашых музыкантаў у выканальніцкіх конкурсах: на многіх такіх спаборніцтвах пачатковы адбор ідзе на аснове дасланых аўдыя-відэаматэрыялаў. Раней вучні й выкладчыкі вымушаны былі самі шукаць, дзе тое зрабіць".

БЕЛТА

Удзельніцы святочнага канцэрта ў часе адкрыцця

Рэспубліканская музычная школа-дзесяцігодка (цяпер адзінаццацігодка) пры Беларускай дзяржканцерваторыі, як яна раней называлася, пераехала ў будынак (сёння — плошча Свабоды,7) у 1947 годзе. Да таго часу яго абжывалі ўстановы, якія да музыкі не мелі дачынення. Напрыклад, з 1699 года ў будынку месцілася езуіцкая школа, што ўваходзіла ў склад знакамітага Мінскага езуіцкага калегіума. Пазней туды "пасялілі" свецкую школу. Пасля будынак пераўтварылі ў Дом губернатара. У гады Першай сусветнай вайны там размяшчаўся нават шпіталь… Гістарычнае аблічча будынка было адноўлена пры апошняй рэканструкцыі настолькі, наколькі гэта ў нашым часе магчыма.

БЕЛТА

Так выглядае цяпер будынак гімназіі-каледжа

Урачыстае адкрыццё гімназіі-каледжа праходзіла з удзелам Міністра культуры Юрыя Бондара, які ўзгадаў пра творчыя дасягненні ўстановы. За апошнія тры гады таленавітыя музыканты гімназіі-каледжа атрымалі 428 перамог на прэстыжных міжнародных творчых спаборніцтвах. Лаўрэатамі й стыпендыятамі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі сталі 83 навучэнцы.

У гімназіі-каледжы на сённяшні дзень займаюцца каля 440 юных музыкантаў.

Ганна Лагун

ДЫПЛАМАТЫЧНАЯ ПОШТА

Знаёмцеся: Ганаровы консул Ян Шынака

Ганаровым консулам Беларусі ў Ольштыне (Польшча) стаў вядомы польскі бізнесмен, кіраўнік і ўласнік групы "Шынака-Мэбле", адзін з найбуйнешых польскіх інвестараў на Беларусі

У рэдакцыю паступіла паведамленне з Амбасады Беларусі ў Польшчы пра інаўгурацыю Ганаровага консула Беларусі ў Ольштыне. Тая імпрэза праходзіла 30 ліпеня 2020 года ў Амбасадзе Беларусі. Надзвычайны й Паўнамоцны Амбасадар Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча Уладзімір Чушаў ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў Ганароваму консулу Беларусі ў Ольштыне Дзяржаўны сцяг Беларусі, консульскі патэнт і пячатку. Дырэктар Усходняга дэпартамента Міністэрства замежных спраў Польшчы Ян Хафмокль ад імя Міністэрства ўручыў экзекватуру.

БЕЛТА

Амбасадар Уладзімір Чушаў уручае консульскі патэнт Яну Шынаку

Ян Шынака будзе ажыццяўляць сваю дзейнасць у консульскай акрузе, якая ўключае ў сябе Варміньска-Мазурскае, Куяўска-Паморскае й Паморскае ваяводствы Польшчы. Так што прадоўжана распачатая ў 2019 годзе — прызначэннем Марка Расіньскага Ганаровым консулам Беларусі ў Катавіцах — практыка ўсталявання ганаровых консульскіх устаноў Беларусі ў Польшчы.

На цырымоніі, паведамляецца ў прэс-рэлізе з Амбасады, прысутнічалі прадстаўнікі Міністэрства замежных спраў Польшчы, мясцовых уладаў, кіраўнікі прадстаўніцтваў беларускіх кампаній у Польшчы.

Мы паглядзелі: у інтэрнэце ёсць і асартымент у Беларусі кампаніі SZYNAKA-MEBEL, якую шаноўны Генконсул Ян Шынака ўзначальвае. Спадзяемся, шаноўны пане Ян, што вашая консульская праца паспрыяе пашырэнню ды ўмацаванню беларуска-польскіх стасункаў у розных сферах.

Іван Ждановіч

СА СТУЖКІ НАВІН

Узнагароды ўручаць у Бялынічах

Сталі вядомыя сёлетнія лаўрэаты Нацыянальнай літаратурнай прэміі, якая ў Беларусі ўручаецца з 2015 года. На конкурс было прадстаўлена 80 кніг, якія выйшлі ў 2019-м, да змагання дапусцілі 64. Начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Мінінфармацыі Уладзімір Андрыевіч на прэс-канферэнцыі ў Мінску адзначыў: сёлета галасаванне стала таемным.

Уладзімір Сцяпан

Сярод 14 прэтэндэнтаў у намінацыі "Проза" перамог Уладзімір Сцяпан з кнігай "Хвалі". У намінацыі "Паэзія" на перамогу прэтэндавала 12 кніг, лепшым прызнаны Валерый Грышкавец з кнігай выбранага "Остаюсь навсегда". Найбольш канкурэнтнай была намінацыя твораў для дзяцей і юнацтва: 19 аўтараў. Перамагла кніга-квэст Кацярыны Хадасевіч-Лісавой "Ключ ад Вялікай каштоўнасці". Журы, дарэчы, назвала Кацярыну сапраўднай пісьменніца XXI стагоддзя, адзначыўшы й незвычайную форму яе твораў, і ўменне аўтара працаваць з юнымі чытачамі, рабіць яркія прэзентацыі. У намінацыі "Крытыка й літаратуразнаўства" лепшай прызнана праца пра беларускіх пісьменнікаў XII–XVII стагоддзяў вядомага літаратуразнаўцы Івана Саверчанкі "Магія слова". У намінацыі "Публіцыстыка" лаўрэатам стаў Ігар Пракаповіч — з кнігай "Пастаўшчына", якая пабачыла свет у серыі "Падарожжы па родным краі" выдавецтва "Беларусь". І, нарэшце, у намінацыі "Дэбют" адзначаны зборнік вершаў Вольгі Нікіценкі "Сузор'е птушкі". А ў намінацыі "Драматургія" другі год запар пераможцы не вызначаныя.

Кацярына Хадасевіч-Лісавая

Узнагароды лаўрэатам уручаць у Бялынічах 6 верасня, калі там будзе адзначацца Дзень беларускага пісьменства.

Візы для Еўрасаюза: 35 еўра

З 1 ліпеня ўступіла ў сілу пагадненне аб спрашчэнні візавага рэжыму паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам. Галоўнае ў ім для беларускіх грамадзян: прасцей атрымліваць кароткатэрміновыя візы для ўезду ў Еўрасаюз, бо візавы збор зніжаецца да 35 еўра ды адмяняецца для пэўных катэгорый падарожнікаў. Зніжаны й максімальны памер збору за абслугоўванне (для візавых цэнтраў) і тэрмін, за які консульствы прымаюць рашэнні па заяве аб выдачы візы. Некалькі катэгорый падарожнікаў змогуць атрымліваць шматразовыя візы з павелічэннем тэрміну дзеяння — да пяці гадоў. Пры тым ім давядзецца прадастаўляць менш дакументаў, якія пацвярджаюць мэту паездкі.

Адначасова ўступіла ў сілу й пагадненне аб рэадмісіі, якое прадугледжвае, што Беларусь і Еўрапейскі саюз павінны будуць ажыццяўляць прыём назад на сваю тэрыторыю ўласных грамадзян, грамадзян трэціх дзяржаў і асоб без грамадзянства, якія не адпавядаюць або перасталі адпавядаць крытэрыям легальнасці на тэрыторыях адзін аднаго. У дакуменце замацавана прадастаўленне Беларусі двухгадовага пераходнага перыяду адносна рэадмісіі грамадзян трэціх дзяржаў. У сумеснай дэкларацыі да пагаднення змешчана абавязацельства Еўрасаюза аб аказанні краіне тэхнічнай і фінансавай падтрымкі ў гэтай галіне.

Падрыхтаваў Іван Ждановіч

СПРАДВЕЧНАЕ Й НАДЗЁННАЕ

Хлеб у хаце гаспадар

Як вялікую й заўсёдную каштоўнасць шануюць беларусы хлеб. І ўсё, што з ім звязана, таксама ўшаноўваецца ў нашай культуры.

Жніво пачалося!

Жнівень — месяц каласісты, кажуць у народзе. Асабліва душа радуецца, калі колас пшанічны ў полі поўны, залаціcты. І ўсе думкі ў хлебаробаў цяпер пра тое, як управіцца ў час, уражай сабраць. Так было на Беларусі спрадвеку. Апошні месяц лета менавіта ў гонар жніва й назвалі. А разам са жнівом ходзяць па зямлі нашай народныя абрады Зажынкі, Дажынкі — святочныя ўшанаванні як першага снапа, зжатага ў полі, так і апошняга. Вядома ж, і гаспадароў нівы пры тым велічалі ды жнеек-працаўніц, якіх цяпер паўсюль замянілі магутныя камбайны. Камбайнёрам, шафёрам, усім, хто працуе ў зладжаным жніўным канвееры таксама і ў нашым часе — усеагульная павага й пашана.

Мне помніцца з маленства: жнейкі ў поле на Зажынкі ішлі апранутымі ў чыстую вопратку. Белыя хусткі на галовах. Перад нівай полю кланяліся ды, папрасіўшы падмогі Усявышняга, перахрысціўшыся (бывала, толькі ў думках у атэістычную пару) пачыналі працу. Зажаўшы першы сноп, неслі яго па ўсім сяле з песнямі. Дарылі гаспадару прыкладна з такімі словамі: “Вось, гаспадарыку, табе снапочак./ Беражы яго на другі гадочак”. Гаспадыні ж, бывала, ускладалі на галаву й вянок з каласоў. А гаспадары частавалі жнеек квасам бы рознымі прысмакамі.

Адметнасць абраду Дажынак у тым, што ў ім праяўлялася моцная паяднанасць чалавека працы з самой нівай, з яе ўраджаем. Апошні сноп жнейкі перавязвалі прыгожымі стужкамі, уручалі гаспадару з гаспадыняй, якія іх за добрую працу ды павагу частавалі. Потым той сноп-Гаспадар ставілі ў хаце на покуці, самым ганаровым месцы. Во якая хлебу пашана! А ніўцы, ладзячы з ёй дыялог, пакідалі жменьку нязжатай збажыны, завязвалі яе ў бараду ды стужкамі каляровымі ўпрыгожвалі (каб залагодзіць дух поля), між каласкоў глебу выполвалі (каб у наступным годзе пустазелле на полі не вадзілася) і хлебам полю аддзячвалі (спецыяльна кавалачак закопвалі). Усё гэта рабілася ў імя будучыні: каб і ў наступным годзе ніва радзіла поўным коласам. Дарэчы, у назве гомельскіх зернеўборачных камбайнаў прыжылося важкае ды працавітае, звонкае імя: “Палессе”. Менавіта гэткіх камбайнаў цяпер большасць на нашых палетках.

Хлебаробскае майстэрства: ад старэйшых да малодшых

З павагай ставіцца да кожнай крошкі хлеба — таксама ў народнай традыцыі. Войны ж не раз пракочваліся па Бацькаўшчыне: нішчылі працаўнікоў, іх нівы, разаралі гаспадаркі. Таму й галодных гадоў хапала, калі знак роўнасці ставіўся між хлебам і жыццём. Памятаю, як мне, малому, у пасляваенную пару маці рабіла суслу: кавалачак намочанага ў вадзе хлеба загортвала ў палатняную анучку, давала ў рот. І гэта мяне супакойвала, есці не так хацелася. Гэтаксама рабілі беларускія сялянкі спрадвеку, гадуючы дзяцей. А смак той суслы я й цяпер памятаю.

Хлеб у хаце гаспадар. Лепей хлеб з вадою, чым пірог з бядою. Хлебная ніва — як дзіцячая калыска. Хлеб на стале — дом багаты… Гэтыя ды шмат іншых выслоўяў падкрэсліваюць паважлівае стаўленне беларусаў да хлеба. Павага да яго ў народзе не меншая, чым да самой зямелькі роднай. Шмат дзе я пабываў у замежжы й чуў ад супляменнікаў: помніцца ім Бацькаўшчына са жнівом, з духмяным хлебам, спечаным матуляй. От жа быў хлеб! Яго, казалі, як ясі, то нос у прысядку скача. Шмат песень у нас пра жытнёвае поле, каласы, хлебныя нівы, родныя мясціны. Такія беларусы і ў замежжы спяваюць.

Першы сноп нажалі жнейкі ў Веткаўскім раёне Гомельшчыны

Хораша дыхаецца ў жніўні ля ніваў, што даспельваюць каласы. Па сутнасці, гэта ж нашая заможная будучыня там навідавоку. Не сакрэт: увесь беларускі агракомплекс напрамую залежыць ад ураджаю збожжавых культур, а цяпер і кукурузы — яе з кожным годам высяваецца ўсё больш. У жніўную пару ад рання да глыбокай ночы, пакуль раса не ўпадзе, працуюць на нівах камбайны. Прычым не рэдкасць на жніве й сямейныя экіпажы. Бацькі прывучаюць сыноў, а нават і дачок да сялянскае працы. Вясковыя падлеткі працуюць і на зернатаках. Ці варта казаць, што ўражанні ад такіх жніўных талокаў, дзяржаўна важнай калектыўнай працы застаюцца ў памяці юных працаўнікоў на ўсё жыццё.

Хлебаробам на Бацькаўшчыне — заўсёдная пашана. І дзяржаўнае свята Дажынкі з тых традыцый выросла ў пару незалежнай Беларусі. Свята па-ранейшаму жыве ў аграгаспадарках, раёнах, ладзяць і абласныя Дажынкі. Ушаноўваюць працаўнікоў вёскі, бо па-ранейшаму ў нас хлеб — усяму галава. Вось і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка перад выбарамі слушна заўважыў, што выбарчая кампанія — другасная ў параўнанні са жнівом, кампаніяй уборачнай: бо есці ж хочацца заўсёды… А калі багата збожжа ў засеках, то можна тады й танчыць, і спяваць — як тое й робіцца на Дажынках.

Хлеб як сімвал дабрабыту, шчаснай долі, прыгожага жыцця шырока скарыстоўваецца ў беларускіх абрадах: пры сустрэчы ганаровых гасцей, у вясельнай цырымоніі. Абрад засялення ў новую хату — таксама

Абрад Зажынкі ў Аршанскім раёне Віцебшчыны

з хлебам: першымі ўносяцца ікона, непачаты каравай хлеба са жменькай солі альбо, раней, дзяжа з цестам.

То хай штогод шчодра каласіцца родная ніва, хай багацее родная Бацькаўшчына! Тым жа, хто хоча паспытаць іншага, не здабытага сваёй працай хлеба — раю ўважліва перачытаць беларускую народную казку “Лёгкі хлеб” ды суаднесці яе глыбокую мудрасць з днём сённяшнім. І зрабіць высновы — на карысць хлеба, уласным мазалём на роднай ніве здабытага.

Мікола Котаў, фальклярыст.
Фота **БелТА**.

ВЕСТКІ З СУПОЛАК

У Ветспілсе і Ліепаі таксама галасавалі

Ансамбль “Паўлінка” спявае ў Беларускім доме Ліепаі ў дзень выбараў беларускія песні

9 жніўня, у дзень выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у Латвіі дзейнічалі два выбарчыя ўчасткі, дзе грамадзяне Беларусі маглі прагаласаваць. Было арганізавана таксама выязное галасаванне ў Вентспілсе й Ліепаі.

У Латвіі былі створаны выбарчы ўчастак № 94 — у Амбасадзе Беларусі ў Рызе й выбарчы ўчастак № 95 — у Генеральным консульстве Беларусі ў Даўгаўпілсе. А для грамадзян, якія не мелі магчымасці прагаласаваць на згаданых участках, было арганізавана выязное галасаванне: у Вентспілсе й Ліепаі. Канкрэтна ў нашым горадзе выязную камісію прадстаўлялі супрацоўнікі Амбасады Беларусі ў Латвіі: Першы сакратар Юры Колесаў і загадчык гаспадаркі/камендант Дзмітры Цімафееў.

Па словах Юрыя Колесава, жаданне прагаласаваць у Ліепаі выказалі каля 30 чалавек. У дзень выбараў у Ліепайскім Беларускім доме гучалі беларускія песні: спяваў мясцовы ансамбль беларускай песні “Паўлінка”, якім кіруе Жанна Буйніцкая. Некаторыя з выбаршчыкаў да таго ж упершыню пабывалі ў Ліепайскім Беларускім доме, больш даведаліся аб працы Беларускай суполкі “Мара”. І не выключана, што ў хуткім часе нас у суполцы стане яшчэ больш.

Анжэла Фаміна, г. Ліепая.
Фота аўтара.

Дарэчы. Паводле афіцыйнай інфармацыі Міністэрства замежных спраў, за межамі дзяржавы ў дзень выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь працавалі 44 участкі для галасавання.

Паўстагоддзя ў адкрытым моры

Дом-карабель, Феадасійскі музей Аляксандра Грына — пісьменніка, які меў беларускія родавыя карані — адзначыў 50-гадовы юбілей

Феадасійскі музей Аляксандра Грына

Аляксандра Грына нездарма называюць чараўніком: бо многае з таго, да чаго ён у жыцці дакранаўся, станавілася цудоўным. Цуды працягвалі адбывацца й праз шмат гадоў пасля яго сыходу. Так здарылася й з вядомым сёння феадасійскім домам, дзе ён жыў і працаваў у 20-х гадах мінулага стагоддзя. Звычайны дом ператварыўся ў старадаўні карабель пад ветразямі, які сонечным летнім днём адправіўся ў плаванне. Урачысты выхад у адкрытае мора здарыўся 9 ліпеня 1970 года. Зерне таго цуду было пасеяна, калі ў яго сценах пісаліся "Залаты ланцуг", "Тая, што бяжыць па хвалях" ды многія іншыя цудоўныя грынаўскія творы. І вось ужо мінула 50 гадоў, а дом-карабель гэтак жа імкліва ляціць па хвалях, выносячы сваіх пасажыраў у светлыя краіны мары й надзей, якія спраўдзіліся, дзіўных адкрыццяў і прыгод.

За гэтыя гады невялікі літаратурна-мемарыяльны музей стаў сапраўдным культурным цэнтрам — месцам яднання людзей мастацтва, навукі й проста рамантыкаў і летуценнікаў. Тут вядзецца вялікая навукова-даследчая й асветніцкая праца, праходзяць навуковыя канферэнцыі, творчыя сустрэчы й фестывалі. Музей атрымаў неверагодную колькасць віншаванняў з залатым юбілеем, якія прыходзяць з усяго свету, і ў тым ліку ад вядомых літаратараў, мастакоў, музыкаў, артыстаў, палітычных дзеячаў. Прыйшло віншаванне й на беларускай мове: ад беларускай суполкі Феадосіі "Спадчына", якая шмат гадоў супрацоўнічае з музеем пісьменніка. Яно й зразумела, бо Аляксандр Грын — наш суплямennік. Ягоны бацька паходзіў з дваран Віленскай губерні, цяпер гэта тэрыторыя Віцебскай вобласці (гл.: "У Аляксандра Грына — беларускія родавыя карані" — ГР, 13.08.2015). За гады існавання Музея Грына ў ягоных сценах не раз праходзілі літаратурна-музычныя вечарыны й выставы, прысвечаныя беларускай культуры.

На жаль, юбілейныя ўрачыстасці сёлета з-за пандэміі не маглі адбыцца, і большасць віншаванняў былі толькі віртуальнымі. Але затое якімі! Музею прысвячалі вершы, музыку, запісвалі кліпы, міні-спектаклі й відэазвароты. Іх можна ўбачыць у сацсетках Фэйсбук (група "Друзья Феодосийского музея Александра Грина") і Вконтакте (група "Музей Грина — Феодосия"). А свята ўсё ж мы адзначылі адкрыццём для наведвання адразу дзвюх выстаў з фондавай калекцыі: графіка й батык XVIII — XXI стагоддзяў. Сярод аўтараў работ — вядомыя мастакі савецкага часу, у тым ліку стваральнік мастацкага праекта музея Сава Бродскі й легенда 60-х гадоў Надзя Рушава.

Грынаўскі дом-карабель запрашае ўсіх у цудоўнае марское падарожжа пад ветразямі, напоўненымі старым добрым ветрам надзеі!

Ала Ярмілава,
навуковая супрацоўніца
Феадасійскага музея А. С. Грына

Малавядомыя астравы Грынландыі

У інтэрнэце мы знайшлі артыкул "Севастопольская тайна Александра Грина" Марыны Цітовай, якая мае родавыя карані ў Беларусі. Піша пра цікавую мастацкую экспазіцыю, прысвечаную Аляксандру Грыну й ягонай творчасці, у фае кінатэатра "Моряк" на Паўночнай старане Севастопаля. Аўтар таго прысвячэння — мастак Уладзімір Адзееў, адзін з удзельнікаў праекта рэстаўрацыі старога будынка кінатэатра. І гэта менавіта ён арганізаваў Музейны пакой Аляксандра Грына ў былой севастопальскай турме, дзе з Уладзімірам і сустрэлася аўтарка. Мастак даўно вывучае творчасць пісьменніка. І, як лічыць, разгадаў адзін з яго сакрэтаў, бо прыйшоў да высновы, што менавіта Севастопаль, розныя часткі яго "засвяціліся" ў грынаўскіх творах — але пад іншымі назвамі. У згаданым Музейным пакоі намалявана карта Грынландыі, краіны Аляксандра Грына, якая дзівосным чынам суадносіцца з рэальнай картай Севастопаля. Паводле версіі Уладзіміра Адзеева, Грын у сваіх творах зашыфраваў менавіта Севастопаль: "Так, Зурбаган — это центр Севастополя. Город Храм — Херсонес. Херсонесский маяк он назвал Лисским. Климентьевский монастырь — общиной Голубых Братьев, город Верд — находится на Северной стороне, Гель-Гью переводится как озеро на юге, болотистое озеро, которое засыпал адмирал Лазарев, строя казармы… Ассоль-корабельная — так называли в книге героиню "Алых парусов". Угольщик Филипп — имеет именно такую профессию: не дворник, не сапожник… Потому что между Лиссом и Каперной находилась угольная пристань Севастополя: уголь туда привозили и разгружали для броненосцев…"

У тэксце Марыны Цітовай пададзены й фотаздымак магіл блізкіх родзічаў Аляксандра Грына, ягоных дзеда й бабулі (памылкова ў тэксце ўказана, што маці): Леанарда й Надзеі Грынеўскіх. Фотаздымак зроблены ў Беларусі, пры старым касцёле вёскі Задарожжа. Мы знайшлі на карце: Глыбоцкі раён Віцебшчыны, злева ад дарогі на Полацк. А сядзіба Якубенкі (з націскам на "у"), якая належала раней дзеду пісьменніка, паводле выдання "Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь" (Мн., 2009) фіксуецца ў Пліскім сельсавеце: як хутар з такой жа назвай.

Ала Ярмілава напісала нам, прачытаўшы тэкст Марыны Цітовай, што з мастаком Уладзімірам Адзеевым супрацоўнікі Феадасійскага музея Аляксандра Грына добра знаёмыя: у фондах музея зберагаецца больш за 40 ягоных работ. І на "Грынаўскія чытанні" ў Феадосію ён прыязджае, а партрэт Аляксандра Грына яго работы вісіць у кабінеце дырэктара.



Стэфан Еўзебіуш Грынеўскі

Напярэдадні юбілею Аляксандра Грына мы стэлефанаваліся з старэйшым навуковым супрацоўнікам Глыбоцкага гістарычна-этнаграфічнага музея Аляксандрам Хайноўскім. Ён расказаў, што ў гонар 140-х угодкаў пісьменніка, які нарадзіўся 11 жніўня (23 па новым стылі) 1880 года, энтузіясты з Глыбокага ды іншых месцаў Беларусі 22–23 жніўня ладзяць велапрабег. Абвестка пра тое пададзена на сайце музея, была ў райгазеце. Паедуць ад райцэнтра ў мясціны, звязаныя з Грынеўскімі. Па словах Аляксандра, кіламетраў 27 у адзін бок будзе. Ён удакладніў, што пры згаданым касцёле пахаваныя дзядуля, бабуля й дзядзька пісьменніка. Кажуць, дзядзька быў вядомы ў акрузе як добры лекар. Аляксандр Хайноўскі зацікавіўся Грынам не выпадкова: ягоная бабуля жыла ў вёсцы Кукры, непадалёк ад месцаў, звязаных з родам Грынеўскіх. Жывучы ў бабулі, унук бачыў там яшчэ ў дзяцінстве прыгожыя вербы, сажалку, парэшткі былых пабудоў, тамтэйшыя адметныя краявіды.

У часе велападарожжа плануюцца фотаздымкі, сустрэчы з мясцовымі жыхарамі, са святаром Задарожскага касцёла. Аляксандр Хайноўскі хоча высветліць: можа збераглiся даўнія запісы ў касцельных кнігах.

Нагадаем, што бацька Аляксандра Грына — Стэфан Еўзебіуш Грынеўскі (які пазней стаў Степаном Евсеевичем) (1843–1914), быў шляхціцам з родавага маёнтка Якубенкі Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1863-м Стэфан Грынеўскі быў сасланы ў Томскую губерню за ўдзел у паўстанні Кастуся Каліноўскага. У 1868-м пераведзены на жыхарства ў Вяцкую губерню (цяпер Кіраўская вобласць). Там ажаніўся з рускай, і ў 1880-м у іх сям'і нарадзіўся сын Аляксандр: будучы пісьменнік Аляксандр Грын.

Іван Ждановіч

ЛІТАРАТУРНЫЯ МАСТЫ

Гучыць Караткевіч і па-туркменску

Адзін з сёлетніх нумароў туркменскага літаратурна-мастацкага часопіса "Дунья эдэбіяты" ("Сусветная літаратура") змясціў на тры развароты грунтоўную гутарку пра беларускую й туркменскую літаратуры й сувязі паміж імі

Суразмоўцамі туркменскага пісьменніка Максата Аламурадава выступілі Алесь Бадак (дырэктар выдавецтва "Мастацкая літаратура", паэт, празаік, крытык, перакладчык) і Аляксей Чарота (намеснік дырэктара Выдавецкага дома "Звязда" — галоўны рэдактар газеты "Літаратура і мастацтва", публіцыст, перакладчык). Летась яны паўдзельнічалі ў міжнароднай кніжнай выставе ў Ашхабадзе. У гутарцы шмат згадак пра пісьменнікаў Туркменістана, чые творы ў апошнія гады перакладзены на беларускую мову й надрукаваны ў газеце "Літаратура і мастацтва", часопісах "Полымя", "Маладосць", альманаху "Далягляды".

Часопіс "Дунья эдэбіяты" звязвае з беларускай літаратурай трывалая дружба. На яго старонках друкуюцца пераклады твораў беларускіх паэтаў і празаікаў. І цяпер у партфелі часопіса — новыя пераклады беларускай паэзіі. У прыватнасці, падборку вершаў Уладзіміра Караткевіча на туркменскую мову пераўвасобіў Джумагельды Мулькіеў. Прыемна, што публікацыя прыйдзе да чытача ў пару, калі адзначаюцца 90-я ўгодкі класіка беларускай літаратуры.

Кастусь Лешніца

Пра класіка — чувашскі паэт

Класіку беларускай літаратуры Уладзіміру Караткевічу прысвечаны многія паэтычныя творы. У свой час была выдадзена кніга "Уладзімір Караткевіч: вядомы і невядомы". Дык там адзін з раздзелаў выдаўцы склалі з вершаў-прысвячэнняў. І хоць тады былі сабраныя далёка не ўсе творы, прысвячэнняў аказалася недзе каля 60! У Леаніда Дранько-Майсюка ёсць нават дзве "караткевічаўскія" паэмы.

У апошні час вершы-прысвячэнні Уладзіміру Караткевічу з'явіліся і ў іншых нацыянальных паэзіях: рускай (Юрый Шчарбакоў), чувашскай (Валеры Тургай), украінскай (Глеб Кудрашоў), чачэнскай (Адам Ахматукаеў), сербскай (Даяна Лазаравіч)… Нядаўна вядомы паэт Мікола Мятліцкі пераклаў яшчэ адзін чувашскі верш, прысвечаны беларускаму мастаку слова, — "Памяці У. С. Караткевіча". Аўтар — народны паэт Чувашыі Юрый Семяндэр.

Паэт з Чабаксар бываў у Беларусі, ён добра ведае беларускую літаратуру ранейшых дзесяцігоддзяў. Перакладаў беларускую паэзію на чувашскую мову. А цяпер спрычыніўся да нашай беларускай старонкі й такім чынам…

Кастусь Ладуцька

У бой ідзе паэзія сыноў

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Захацелася патрымаць выданне ў руках — і мы звярнуліся з такой просьбай да супляменніка. Пісалі, дарэчы, пра яго раней (“Зямля і неба Уладзіміра Шуглі: У Ганаровага Генеральнага консула Беларусі ў Цюменьскай вобласці любоў да Сібіры й зямлі яго продкаў у крыві” — “Беларусь. Belarus”, 2016, № 5. Гл. у інтэрнэце: https://www.sb.by/articles/zyamlya-neba-uladz-m-ra-shugl.html). Ведаем, што для вядомага беларуса Цюмені зямля продкаў, іх традыцыі — важная частка яго самога як асобы. Калі восенню 2013-га ў камандзіроўцы сустрэліся з Уладзімірам Фёдаравічам, ён паказваў нам і невялікі “музей” з экспанатамі з Беларусі, свой галінасты радавод (у яго самога чацвёра дзяцей) у рамачцы. А фатаграфіі бацькі з маці заўсёды з ім побач: у рабочым кабінеце. Суразмоўца цёпла гаварыў пра паездку ў родную вёску бацькі: Руціца ў Карэліцкім раёне Гродзеншчыны. Згадаў пра паходжанне прозвішча: шугляй у Беларусі называлі вялікую лодку-даўбёнку з суцэльнага ствала дуба. Пэўна, і продкі Уладзіміра Фёдаравіча мелі справу з дубамі, спрычыніліся да рэдкага “суднабудаўнічага” рамяства. Яшчэ ўспомніў, як бацька, былы франтавік, вучыў яго будаваць дом з бярвення. Падумалася тады: а не разгубіў былы франтавік на жыццёвых дарогах спадчынны досвед працы з сякерай!

І вось на пачатку ліпеня з Цюмені, з прыёмнай Ганаровага Генконсула ў Мінск прыйшла бандэроль з кнігамі — як для рэдакцыі, так і для перадачы ў дар Музею літаратуры. Дасланыя нам кнігі “Победители” (зборнік з творамі беларускіх і цюменьскіх аўтараў да 70-годдзя Перамогі, выйшаў у Цюмені ды Мінску ў 2014 годзе), “И снова май, победный май”, а таксама тры зборнікі вершаў Уладзіміра Шуглі: “Четвертое измерение” (2013, Цюмень), “Имя твоё” (2016, Мінск), “Шестое чувство” (2019, Курган). За тое дзякуем як Уладзіміру Фёдаравічу, так і ягонай памочніцы Любові Генадзеўне. Яна даслала нам і юбілейны буклет: сёлета Рэгіянальнай грамадскай арганізацыі “Саюз — інтэграцыя брацкіх народаў” спаўняецца 15 гадоў. І пра тое мы раскажам, але іншым разам.

Згаданая прадмова ў сёлетняй кнізе мае назву “Сцяг Перамогі ў надзейных руках”. Прадстаўляючы творчасць паэтаў Зямлі Цюменьскай, Уладзімір Шугля акрэслівае, што пішуць яго калегі па пяры на тэмы вайны, патрыятызму, гераізму, самаахвярнасці, воінскага брацтва. Тэмы, удакладняе, блізкія й дарагія таксама яму: “Гэта маё жыццё й маё сумленне, мой маральна-грамадзянскі стрыжань. І гэта не гучныя словы. Мае карані ў Беларусі. Яе гераічнае мінулае, стойкі братні народ, які

На прэзентацыі зборніка

мужна й з годнасцю прайшоў праз усе выпрабаванні — усё гэта ўва мне. Як і прыклад бацькі-франтавіка: “Когда я слышу о войне/ Отец приходит в мою память. Пока я жив — он жив во мне,/ Несём мы вместе наше знамя…”. Вось такі пераход у прадмове ад прозы да паэзіі. Вобразна, хораша, глыбока!

У кнізе пададзены 4 вершы Уладзіміра Шуглі, і ў адным з іх, 12-радковым, бачым вобразнае развіццё той тэмы, пра сцяг: “Одна из пуль летит моя…/ “Я жить хочу!” — кричит сознанье…/ И спас отец — закрыл меня…/ Теперь в руках моих то знамя!”.

Мы знайшлі ў нэце, у базе дадзеных “Подвиг народа” (http://podvignaroda.ru/?#tab=nav Home) ажно пяць згадак пра ўзнагародныя дакументы капітана Фёдара Міхайлавіча Шуглі, 1907 года нараджэння. Пяць ардэноў! Імі камандзір батальёна, які вёў барацьбу з бандамі, падпольнымі арганізацыямі ў вызваленых Чырвонай арміяй рэгіёнах Беларусі, быў ушанаваны ў 1944–45 гадах: ордэн Леніна, два ордэны Чырвонага Сцяга, два ордэны Айчыннай вайны I ступені. Месцам нараджэння ў дакументах значыцца: “Литовская ССР, г. Вильно”. Магчыма, так трэба было ў той час? Альбо сапраўды ў Вільні герой нарадзіўся? Мяркуем, тое ведае Уладзімір Фёдаравіч, які даследаваў свае родавыя беларускія карані.

Тут варта яшчэ згадаць і пра тэкст, які нам летась увосень даслала актыўная няштатная аўтарка з Цюмені Людміла Бакланава: пра традыцыйную сустрэчу студэнтаў і выкладчыкаў Цюменьскага інстытута культуры з паэтам, Ганаровым Генконсулам Беларусі ў Цюменьскай вобласці Уладзімірам Шугляй. На гэты раз прэзентаваўся ягоны чарговы, згаданы ўжо намі зборнік вершаў “Шестое чувство”. Аўтар не толькі чытаў свае творы, але й высвятляў глыбінныя сэнсы, пасылы, у іх закладзеныя. Акцэнтаваў увагу на адказнай ролі паэта ў жыцці краіны, выхаванні людзей, фарміраванні нашага светапогляду. Гаварыў, як важна паўнакроўна жыць не толькі ў свеце матэрыяльным, але і ў духоўным, пра гарманічнае развіццё асобы. А сам для сябе, піша Людміла Бакланава, ён даўно вылучыў простыя й мудрыя правілы, параўноўваючы жыццё нашае з палётам птушкі: “Чтобы удержаться на лету, надо придерживаться девяти векторов в направлении движения. И здесь действуют три “Т”, три “С” и три “Не”. Это Труд, Творчество, Терпение. Это Стыд, Совесть, Сострадание. И — Не сдаваться, Не бояться, Не доверять, то есть все подвергать сомнению, проверять”. Такія прынцыпы жыцця, казаў Уладзімір Фёдаравіч, закладваў у ім бацька. Цяпер жа й сам ён перадае іх не толькі дзецям, унукам, але й слухачам, чытачам. А яго самыя любімыя паэты — рускі Афанасій Фет і беларус Максім Танк, якія спалучалі ў сабе такую “шматвектарнасць”, выяўлялі яе ў сваёй творчасці.

На сустрэчы гучалі песні, напісаныя на вершы Уладзіміра Шуглі Кацярынай Чарнышовай: яна загадвае кафедрай харавога дырыжыравання, прафесар. Выйшаў кампакт-дыск, на якім запісаны 12 песень. Пранікнёныя музыка й вершы ўпрыгожылі сустрэчу. Цікава, што дырэктар бібліятэкі Наталля Сакалова правяла эксперымент, пра які й расказала. Яна папрасіла калег прааналізаваць вершы з розных зборнікаў

Уладзіміра Шуглі. У ходзе чытання даць адказ на пытанне: дзе ж вытокі яго вершаў? І ўсе прыйшлі да высновы: вытокі — у зямлі продкаў аўтара, у Беларусі. “Тэма нябеснай духоўнай сінечы нібы прыпадымае чытача ў кожным радку, нават калі й наўпрост у словах не выяўлена,— гаварыла Наталля Сакалова.— Святло паэтычнай душы аўтара даецца як азарэнне звыш. Беларускія родавыя гены бацькі, тэмы вайны, Хатыні, праваслаўя — там вытокі творчасці Уладзіміра Шуглі”.

Людміла Бакланава паведамляе, што ў творчай сустрэчы паўдзельнічаў старшыня Цюменьскай абласной думы Сяргей Карапанаў. Ён павіншаваў Уладзіміра Шуглю з новым зборнікам паэзіі, пажадаў новых здзяйсненняў на карысць брацкіх народаў Беларусі ды Расіі. Словы ўдзячнасці выказалі старэйшаму сябру, супляменніку старшыня Рэгіянальнай грамадскай арганізацыі беларусаў Цюменьскай вобласці Сяргей Сцяцкевіч з жонкай Таццянай Мецелевай, мастацкая кіраўніца народнага беларускага ансамбля “Лянок” Клаўдзія Зуева. Напрыканцы сустрэчы гучала песня “О, Беларусь мая!”.

Людміла Бакланава нам яшчэ напісала, што на адной з сустрэч з актывам беларускай дыяспары ў Цюмені Уладзімір Шугля прадставіў Анталогію сучаснай рускамоўнай паэзіі Беларусі. У яе ўвайшлі й яго вершы. Выданне “Поэзия русского слова: антология современной русскоязычной поэзии Беларуси” ўключае творы 186 аўтараў, яго можна знайсці ў кнігарнях Беларусі. А на пачатку 2020 года ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прайшла прэзентацыя выдання ў фармаце круглага стала. Падрыхтавана было выданне ў Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі, пабачыла свет у Выдавецкім доме “Беларуская навука” ў 2-х тамах. Аўтары праекта — доктар філалагічных навук, акадэмік НАН Беларусі, галоўны навуковы супрацоўнік Уладзімір Гніламёдаў і кандыдат філалагічных навук, загадчык аддзела ўзаемасувязяў літаратур Мікола Мікуліч. Вядома ж, надрукавацца ў такім салідным выданні — гонар і для Уладзіміра Шуглі, Ганаровага Генеральнага консула Беларусі ў Цюменьскай вобласці Расіі.

Іван Ждановіч

СЦЕЖКАМІ ПАМЯЦІ

Ад Ташкента да Беразянкі

Узбекскі пісьменнік Кучкор Наркабіл піша кнігу пра Пухавіччыну ваенную

Не першы раз наведваўся ў Беларусь узбекскі літаратар Кучкор Наркабіл. Воін-інтэрнацыяналіст, ён у свой час ваяваў у Афганістане. Бачыў пакуты, драматызм у лёсе народа краіны, якая суседзіць з Узбекістанам. Афганская вайна пакінула след у лёсе ўзбекскага журналіста й пісьменніка на ўсё жыццё. Ён напісаў і кнігу пра тое, што бачыў на ўласныя вочы. А цяпер працуе над аповесцю пра першыя дні Вялікай Айчыннай вайны, пра лёсы ўраджэнцаў Узбекістана, якія ваявалі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Беларусі.

Сярод месцаў, якія наведвае Кучкор Наркабіл у Беларусі, — і Пухавіцкі край, што на Міншчыне. Сёлета пісьменнік пабываў там на месцы спаленай фашыстамі вёскі Беразянкі. “Сціплы помнік на магіле жыхароў невялікага ляснога паселішча, самі дрэвы, якія, як мне падалося, схіляюць свае галіны ў вечнай журбе, — расказвае ўзбекскі літаратар, — натхнілі мяне на новыя старонкі пра шматпакутную Беларусь. З цікавасцю я даведаўся, што Беразянка — гэта вёска, якая была творчым, жыццёвым прытулкам народнага песняра Беларусі Якуба Коласа ў перадваенныя гады. Што марыў ён пабудаваць там лецішча. І што ў часе сваёй эвакуацыі ў Ташкенце даведаўся пра трагедыю Беразянкі.”

Кучкор Наркабіл яшчэ казаў, што, вярнуўшыся ў Ташкент, не абміне колясаўскія адрасы, пройдзе па знаёмай Песняру ў вайну вуліцы Сапёрнай. Пісьменнік мае намер паглыбіцца ў тое гора, у тое, якімі слязьмі аблівалася сэрца паэта, калі ён даведаўся, што фашысты спалілі знаёмых яму беразянкаўцаў.

Узбекскі пісьменнік напісаў нарыс пра Беларусь, надрукаваў яго ва Узбекістане. А ў беларускім альманаху “Далягляды” ў перакладзе Навума Гальпяровіча на беларускую мову выйшаў ягоны верш пра Мінск, Беларусь у звязку з тэмай Вялікай Айчыннай вайны.

“У маіх планах — прэзентацыя кнігі пра Беларусь, Пухавіччыну ваенную менавіта ў Беларусі, — дзяліўся сваімі развагамі спадар Кучкор. — Я рады, што пазнаёміўся з Пухавіцкім краем. Удзячны за грунтоўныя экскурсіі, якія ўжо двойчы правёў для мяне Аляксандр Аляксандравіч Прановіч — дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея”.

Алесь Карлюкевіч

РОДНЫЯ СМАКІ

Сялянскія стравы на розныя густы

Кухня Алы Палікарпук старадаўняя, але вельмі сучасная

Гаспадыню аграсядзібы "На Заречной улице" Алу Палікарпук менавіта беларускія сялянскія стравы часта выручаюць, калі госці маюць асаблівасці ў харчаванні. А знаўцы сцвярджаюць: нацыянальныя стравы народжаны з прыродай краіны, яе бяспекай здольныя прывабіць шматлікіх замежных турыстаў.

Ала Палікарпук, гаспадыня аграсядзібы "На Заречной улице", што непадалёк ад Брэста, смачна гатуе для сваіх гасцей. Паспрабаваць яе стравы едуць шматлікія турысты з розных краін. (Падрабязней пра аграсядзібу гл.: "Адпачынак з родным каларытам" — ГР, 26.06. 2020). Гатаваць вучылася яшчэ дзяўчынкай ад бабулі Сцепаніды: дранікі, бабку, кашу пшонную з гарбузом і шмат іншых беларускіх страў. І вельмі смачныя бабуля пякла пірагі! Прычым дазваляла ўнучцы у дзяжы цеста замешваць. Спадарыня Ала й сёння памятае, якое яно было эластычнае, мяккае ды жывое, з адметным пахам. Сёння знакамітая страва яе так і называецца: "Пірагі бабулі Сцешы".

Цяпер Ала Аляксееўна сама навучае іншых кухарскай справе, ладзіць кулінарныя майстар-класы, конкурсы й вебінары. Цікавіцца кулінарнымі здабыткамі беларусаў, ёй раней невядомымі. У гаспадыні ёсць "Беларускія кулінарныя сшыткі" Ларысы Мятлеўскай. Спадарыня Ала чытае кнігі доктара гістарычных навук Тадэвуша Наваградскага: ён даследаваў, як ішла эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX—XX стагоддзях і выдаў шмат кулінарных кніг з рэцэптамі з розных рэгіёнаў Беларусі. Менавіта ад Тадэвуша Антонавіча гаспадыня аграсядзібы й даведалася, што беларуская кухня падзяляецца на сялянскую, шляхецкую і каралеўскую.

Ала Аляксееўна любіць гатаваць гасцям сытныя й простыя сялянскія стравы. Для гатавання іх здаўна выкарыстоўваліся капуста, рэпа, буракі, морква, гарбуз, бульба, агуркі, цыбуля й часнок. А таксама шчаўе, крапіва, лебяда, травы й арэхі, якія можна вырасціць на сваім прысядзібным агародзе. Дарэчы, з-за вялікай колькасці гародніны, зеляніны, грыбоў і ягад у такіх стравах іх многія сучаснікі прымаюць за вегетарыянскія. А найбольш пашыраная нішчымная страва у беларусаў — аўсяны кісель, які, між іншым, гатавалі на рэлігійны пост толькі ў Беларусі.

У сялянскіх сем'ях так прынята было, што мяса й сала елі толькі на святы, ці пакідалі такую каларыйную ежу для мужчын, якія цяжка працавалі ў полі. А вось шляхецкая і каралеўская кухні былі багатыя на далікатэсы — мяса, птушку, рыбу, дзічыну і дэсерты — кожны дзень. "Беларуская кухня ўнікальная, разнастайная, сытная й смачная ў многім таму, што ў ёй цесна перапляліся славянскія, балтыйскія, яўрэйскія, нямецкія ды ўкраінскія традыцыі харчавання. Усе асаблівасці кухні нашага народа стануць зразумелымі трошкі больш, калі час ад часу рабіць невялічкія экскурсы ў кулінарныя сакрэты суседзяў", — лічыць Ала Палікарпук.

Ала Палікарпук

Беларускае меню на 10 дзён ад Алы Палікарпук

Сняданкі:

1. Налiснікі з тварагом, ёгурт хатні, гарбата на травах (кава).
2. Шанежкі з мясам і смятанай, налiснікі, гарбата на травах (кава).
3. Дзяд (пірог з вішняй, разынкамі й павідлам), гарбата на травах (кава).
4. Сырнікі са смятанай, яечня, гарбата на травах (кава).
5. Адкрыты пірог з капустай і грыбамі, гарбата на травах (кава).
6. Каша прасяная з гарбузом, аўсяны кісель, гарбата на травах.
7. Суп (малочны з гарбузом), пірог са шчаўем і мятай.
8. Варэнікі з вішнямі (чарніцамі), аладкі жытнія са смятанай.
9. Грачаная каша, запечаная ў гарбузе, сыр дамашні, гарбата.
10. Зацірка малочная, налiснікі з ягадамі, гарбата на травах (кава).

Абеды:

1. Суп грыбны (з ляснымі грыбамі), бульба адварная з мясам (смажанка ў гаршку), мясная нарэзка (бачок, каўбаса сялянская), гародніна, сок дамашні бярозавы.

2. Юшка (вуха з рачной рыбы), дранікі са смятанай, рулька, запечаная ў духоўцы з гароднінай, сок дамашні яблычны.
3. Бацвіннік (з бацвіннем буракоў), мачанка грыбная з дражджавымі блінамі, мясная нарэзка (бачок, каўбаса сялянская), ягадны кампот.
4. Крупнік (курыны суп з крупамі), каша пшанічная з мясам, нарэзка з гародніны, сок дамашні вінаградны.
5. Жур (суп на аўсянай заквасцы), бульба, запечаная ў духоўцы з сырам і грыбамі, салата з гародніны, кісель ягадны.
6. Капуста, скрылькі (бульба, запечаная з бачком у смятане), нарэзка з гародніны, збіцень (гарбата са спецыямі).
7. Боршч "Калядны", галубцы з мясам, мясная нарэзка (бачок, паляндвіца вяленая), узвар з сухафруктаў.
8. Халаднік, каша грачаная з мясам, наліснікі з начынкай, гародніна, сурыца (газаваны травяны напой).

9. Цярцюха (суп з цёртай бульбай), шчупак у смятане, запечаны з бульбай, нарэзка з гародніны, квас хлебны.
10. Суп фасолевы, бігас (капуста з мясам), пірог з грыбамі, сок грушава-яблычны.

Вячэры:

1. Калдуны з мясам, мачанка з гародніны з дражджавымі блінамі, гародніна, аладкі са смятанай, чай на травах.
2. Рабрынкі ў гаршку, бабка бульбяная са смятанай, салата з гародніны, гарбата на травах.
3. Драчэна бульбяная, курыны закалот (заліўное з курыцай і белымі грыбамі), гародніна, збіцень.
4. Мачанка мясная з дражджавымі блінамі, грыбны торт, гародніна, кісель ягадны.
5. Рыба, запечаная з гароднінай, канверты бульбяныя з курыцай, гародніна, гарбата на травах.
6. Бульбяная запяканка з грыбамі й сырам, гароднінае рагу, рулет з макам, гарбата на травах.
7. Пячыста са свініны, аўсяныя аладкі з грыбамі, гарбата з гародніны, гарбата на травах.
8. Клёцкі бульбяныя, наліснікі з фасоллю, пірог з карыцай, гарбата на травах.
9. Бабка бульбяная з грыбамі, "Торба палешука" (мясныя рулецікі з начынкай), гародніна, гарбата на травах.
10. Калдуны з грыбамі, капусняк (запяканка з капусты з сырам), пірог з яблыкамі, гарбата на травах.

Па новыя ўражанні, новыя смакі ў тым ліку "На Заречную улицу" прыязджаюць госці з розных краін: Польшчы, ЗША, Канады, Ізраіля, Германіі, Кітая, Японіі, Аўстраліі, Азербайджана, Расіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Новай Зеландыі... Сярод іх сустракаюцца вегетарыянцы, веганы... Ёсць і тыя, хто па розных прычынах не ўжывае свініну або ялавічыну. Ала Аляксееўна, маючы шмат розных рэцэптаў страў і вялізную ўжо кухарскую практыку, спрабуе прыстасаваць свае стравы пад густы кожнага з гасцей. І менавіта "сялянскія стравы" пры тым яе заўсёды выручаюць.

У гасцях у Алы Палікарпук можна паспрабаваць нават стравы сярэднявечнай кухні IX —XI стагоддзяў. Рэцэптамі з ёй дзеліцца мясцовы клуб гістарычнай рэканструкцыі, а яна ўвасабляе іх у жыццё. А каб вам было зразумела, у якіх маштабах ёй часам даводзіцца працаваць, асэнсуйце такі факт: гаспадыня аграсядзібы "На Заречной улице" можа накарміць цэлы аўтобус турыстаў. 55 чалавек. Адна! Калі ж госці захочуць у яе застацца на больш працяглы тэрмін, то яна зможа доўга здзіўляць іх разнастайным меню. Гатаваць і не паўтарацца на працягу аднаго ці двух тыдняў. Каб пацвердзіць тое, спецыяльна для чытачоў газеты "Голас Радзімы" гаспадыня склала меню з беларускіх страваў на 10 дзён. Прыгледзьцеся: і сапраўды не знойдзецца ў ім і дзвюх аднолькавых страў.

Рэцэпты ўсіх гэтых смакоццяў вы можаце знайсці на сайце: http://www.kumora.by/recept. І можна падпісацца на youtube-канал Алы Палікарпук, паглядзець відэаролікі кулінарных майстар-класаў па старабеларускай і сярэднявечнай кухні, а таксама вебінары на тэму "Асаблівасці арганізацыі гастранамічнага турызму з элементамі беларускай кухні". Апошнія праходзяць пры падтрымцы аддзела спорту й турызму Брэсцкага аблвыканкама.

Ганна Лагун

НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

"Вербніца" з Чэрвеня ды іншыя

Цікавыя творчыя праекты, што рэалізуюцца ў Беларусі, могуць спатрэбіцца й актывістам беларускіх суполак замежжа

Тым, хто сябруе з інтэрнэтам, цікавіцца беларускай народнай творчасцю, раім паглядзець на Youtube відэафільмы з праекта "Спявае Беларусь". Яго рэалізуе тэлеканал Беларусь 3: http://3belarus.by/, у Фэйсбуку: https://www.facebook.com/tvbelarus3. Гэта своеасаблівае фальклорна-песеннае шоу. Глянуўся нам, напрыклад, народны ансамбль народнай песні "Вербніца" — з горада Чэрвеня, што на Міншчыне. Паглядзіце й вы, сябры! Магчыма, нешта з яго рэпэртуару прыдасца й для спеўных гуртоў замежжа.

У кожнай праграме праекта "Спявае Беларусь" гледачы знаёмяцца з сямейнымі традыцыямі нашага народа, слухаюць родныя песні. Можна ўсім разам падпяваць дзякуючы функцыі "караоке": словы песень бягуць па экране.

Рыгор Гарэшка

100 карцін і 30 гравюр у падарунак Радзіме

Мастак Іосіф Капелян, ураджэнец Бабруйска, жыве ў Ізраілі амаль 40 гадоў, але ягоная сувязь з Радзімай ніколі не перапынялася



VBOBRUISK.BY

Іосіф Капелян на выставе ў Бабруйску. 2017 год.

Звычайна творчы шлях мастака, які настойліва рэалізуе свой талент, пазначаны персанальнымі выставамі. Па іх можна бачыць, у які бок рухаецца творца. Тое прасочвалася й на выставе ў галерэі Бабруйскага мастацкага музея, калі ў маі 2017-га там ладзілася выстава Іосіфа Капеляна "Сустрэча праз сорак гадоў. Нетанія — Бабруйск". Ён прывёз тады ў родны горад 70 прац — і падараваў іх музею. Пра шчодры дар паведаміў, калі адкрывалася экспазіцыя. Мастак яшчэ казаў, што гатовы перадаць гораду таксама іншыя карціны, калі Бабруйск пагодзіцца іх прыняць і захаваць для нашчадкаў. То спадзяемся, што ў прыгожай гісторыі пад назвай "Нетанія — Бабруйск" будзе й годны працяг.

На адкрыцці выставы тады сабраліся сябры й калегі, якія даўно Іосіфа не бачылі, прадстаўнікі грамадскасці горада. Мастак не хаваў хвалявання, казаў: "Вельмі задаволены я ды ўсхваляваны, што тут адкрываецца мая выстава. І не толькі таму, што для паказу выстаўлены мае працы, а яшчэ й таму, што — у горадзе, у якім я нарадзіўся. Гэта горад майго дзяцінства, юнацтва. І маё хваляванне — ад успамінаў, ад сустрэч, і, вядома ж, ад таго, што адкрываецца мая сорак першая выстава".

Іосіф Капелян родам з 1936 года, наведваў мастацкую студыю пры Доме піянераў: ёй тады кіраваў Барыс Бяляеў. З таго творчага асяродка, дарэчы, ішлі ў свет мастацтва такія вядомыя майстры, як Георгі Паплаўскі, Людвіг Асецкі, Леанід Марчанка. Што да Іосіфа, то ён спачатку закончыў Ленінградскае мастацка-графічнае педвучылішча, пасля — факультэт графікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (закончыў у 1966-м, вучыўся ў Арлена Кашкурэвіча й Мая Данцыга). За дваццаць гадоў працы ў выдавецтве "Беларусь" (з 1961 года) афарміў больш за 130 кніг, уступіў у Саюз мастакоў СССР. А ў 1980-м Іосіф Капелян прыняў рашэнне пераехаць у Ізраіль, у Тэль-Авіў. Па тым часе тое азначала: яго імя й творчасць Айчына забудзе…

На шчасце, так не адбылося. Іосіф Капелян не згубіўся ў свеце, годна заявіў пра сябе. Ягоныя карціны ёсць у музеях і прыватных калекцыях розных краін, ён стаў лаўрэатам Міжнароднай прэміі імя Мікалая Рэрыха ў намінацыі "Мастацкая творчасць". А найхвалюючыя, значныя для майстра на творчым шляху — менавіта выставы ў родным Бабруйску. Першая з іх была яшчэ ў 1976-м. Глыбока ў сэрцы ягоным жывуць светлыя сыноўскія пачуцці да зямлі, што яго ўзгадавала, і напісаныя ім пейзажы Нетаніі нагадваюць абшары Бабруйшчыны. Усе гады з часу жыцця ў Ізраілі творца з пяшчотаю згадвае родны горад. І ў 2017-м, прыехаўшы, пабываў на Бабровай вуліцы: там жыве ягонае дзяцінства. Іосіф адзначыў, што вуліца змянілася, але дом родны застаецца такім жа. Падзяліўся развагамі: "У мяне тут магілы дзядулі, бацькі, маці. …Гэта не першы мой прыезд за сорак гадоў. І штораз я тут паглыбляюся ў атмасферу ўспамінаў… Я пастарэў — а горад памаладзеў". Магчыма, да наступнай сустрэчы з Бабруйскам майстар створыць яшчэ не адну карціну з выявай роднага горада.

І Мінск для Іосіфа Капеляна — горад асаблівы, добрыя пачуцці да яго мастак мае ў душы: "Горад, дзе я закончыў мастацкі інстытут, дзе ўсталёўвалася й развівалася мая творчасць". У калекцыю мінскага Мемарыяльнага музея-майстэрні Заіра Азгура мастак у "прыезд у Беларусь-2017" падараваў 30 сваіх гравюр, папрасіў хаця б час ад часу іх экспанаваць. "Дзякуючы такому велікадушнаму жэсту мы й можам бачыць яго працы ў сябе ў Беларусі",— радуецца Вольга Гоманава, якая цяпер — куратар выставачных праектаў Іосіфа Капеляна. Шчодры жэст мастака знайшоў прадаўжэнне ў праекце Нацыянальнага гістарычнага музея: там у ліпені 2018-га працавала выстава майстра, былі паказаны падараваныя творы. Выстава, дарэчы, стала адной з першых у плыні праекта "Шляхамі знакамітых землякоў", які дырэктар музея Павел Сапоцька мае намер прадоўжыць. Тады сучасныя ІТ-тэхналогіі далі магчымасць майстру віртуальна прысутнічаць на адкрыцці чарговай выставы. У сваім відэазвароце ён казаў: "Выстава мастака — гэта магчымасць паказаць свае працы гледачу, а таксама сродак яшчэ раз пацвердзіць культурную повязь паміж людзьмі, паміж мастакамі, паміж краінамі й народамі. Мінск для мяне — горад асаблівы, і добрыя пачуцці да Мінска й Беларусі глыбока ў маёй душы".

І ў Віцебск таксама завітаў Іосіф Капелян — са сваёй выставай "Графіка. Рэтраспектыва": вясной 2019-га. Паспрыяла рэалізацыі цікавага праекта й Амбасада Ізраіля ў Беларусі. У Арт-цэнтры Марка Шагала была прадстаўлена графіка творцы: лінагравюры, афорты, літаграфіі, манатыпіі, гравюры на кардоне. Хоць і схільны майстра ствараць менавіта графічныя працы ("графіка бліжэйшая па маім таленце: для мяне лінія важнейшая, чым пляма"), але ж, удакладняе Вольга Гоманава, ёсць у яго й шмат акварэляў, жывапісных твораў: партрэты, пейзажы, нацюрморты. Па словах мастацтвазнаўцы, карціны творцы настройваюць гледача на ўзвышанае, адухоўленае ўспрыманне навакольля.

Са слоў Вольгі Гоманавай, якая падтрымлівае творчыя стасункі з мастаком, падораныя ім 30 гравюр музейшчыкі плануюць паказваць на іншых творчых пляцоўках пасля таго, як адступіць каранавірус. Цяпер Іосіф Капелян дома, у ізраільскай Нетаніі (там жыве з жонкай Таццянай) працуе штодзень. Галоўнай тэмай ягоных твораў застаецца духоўнасць. Гатовы прыехаць у Беларусь, калі з'явіцца такая магчымасць.

Марыя Мініч,
мастацтвазнаўца

VBOBRUISK.BY

Іосіф Капелян. "Наваколлі Мінска".

Вольга Гоманава з Капелянамі ў Нетаніі, ля іх дома. 2017 год.

Іосіф Капелян:

"…З часоў вучылішча мой улюбёны мастак — Рэмбрант. Я нават зрабіў некалькі партрэтаў у кантрасце святла й ценю, як у яго. Для мяне адна з найвялікшых карцін у сусветным мастацтве — ягоны "Блудны сын"…

…Яшчэ ў СССР я зрабіў работы на тэму Шолам-Алейхема. І ведаў, што я яўрэй, ідэнтыфікаваў сябе так. Але я гэтак жа адчуваю сябе й беларусам, люблю беларускую паэзію, прыроду. Уласна, мяне падштурхнулі да таго выбару. Заўжды лічыў: усе людзі добрыя, калі яны добрыя як людзі, а не таму, што яны належаць да якой-небудзь нацыянальнасці".

Г. ВІННІЦКІ

Ад рэдакцыі. Рыхтуючы тэкст да друку, мы згадалі, што летась у снежні ў Ізраілі ў 57 гадоў памерла мастачка Ілона Барадуліна — адзіная дачка народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна. Ілона мела рэдкі талент мастачкі-імправізатаркі, адметны творчы почырк — і няпростае жыццё. Яе творы выстаўляліся ў Беларусі, Аўстрыі, Расіі, упрыгожвалі вуліцы ізраільскіх гарадоў. Цікава, ці ёсць хоць нейкі шанец працы з яе апошняга — ізраільскага — перыяду жыцця й творчасці пабачыць на радзіме мастачкі? Можа выхадцы з Беларусі ў Ізраілі, з тамтэйшых суполак беларусаў, прадстаўнікі беларускай дыпмісіі неяк таму паспрыяюць?



Уладзімір Дубоўка

ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ

...І тут ён, гэты самы бераг

Больш за 50 гадоў вымушаны быў пражыць у Расіі, удалечыні ад Бацькаўшчыны, вядомы беларускі паэт Уладзімір Дубоўка. Родавыя ж карані яго — у Пастаўскім раёне Віцебшчыны.

Сёлета — 120 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Дубоўкі: ён пабачыў свет 15 ліпеня 1900 года. (Афіцыйна ў біяграфіях пішацца гэты год. Але краязнаўца з Пастаўшчыны Ігар Пракаповіч у допісе ў рэдакцыю згадвае пра нядаўна знойдзеную метрыку аб нараджэнні Уладзіміра Дубоўкі. Паводле яе, будучы творца з'явіўся на свет у 1901 годзе.— **Рэд.**) Уладзімір Мікалаевіч пакінуў заўважны след у беларускай культуры як паэт, празаік, мовазнавец, перакладчык і крытык. Працуючы з ягонай велізарнай спадчынай, даследчыкі выявілі мноства псеўданімаў. Сярод іх: Ганна Аршыца; У. Гайдукевіч; У. Гайдуковіч; Ул. Гайдуковіч; Уладзімір Гайдуковіч; Б-сь Дубоўка; Бладысь Дубоўка; Уладзік Павадыр; Тупяец; В. Туянец; У. Д-ка; У. Д-на… Цікава было б даследаваць іх паходжанне. Магчыма, карані некаторых звязаны неяк і з малой радзімай творцы — з вёскай Агароднікі (цяпер — Пастаўскі раён Віцебшчыны) тагачаснага Вілейскага павета Віленскай губерні. Спрадвечна беларуская Віленшчына яго ўзгадавала, і ў лютым 1918-га ён, закончыўшы Нова-Вілейскую настаўніцкую семінарыю, пакінуў родныя мясціны.

Другі этап жыцця Уладзіміра Дубоўкі — расійскі. Пражыў беларус у Расіі 56 гадоў, там і памёр 20 сакавіка 1976 года — у Маскве. У 1947–49 гадах пажыў у Грузінскай ССР, а так — усё Расія. Прычым амаль палову з тых 56-ці — 27 гадоў! — быў у сталінскіх лагерах. Толькі ў часе хрушчоўскай адлігі Уладзімір Дубоўка быў поўнасцю рэабілітаваны. Без малога чвэрць стагоддзя быў масквічом. Там жа ў 1922–25 гадах займаў пасаду рэдактара беларускага выдання "Весніка ЦВК, СНК і СПА Саюза ССР", адначасова быў адказным сакратаром Прадстаўніцтва БССР пры Урадзе СССР. А пасля рэпрэсій зусім іншая праца ў яго была ў Маскве: сталярствам на хлеб там зарабляў. Аднак і жывучы ў Расіі, плённа працаваў на ніве беларускай культуры.

У творах 20-х гадоў Уладзімір Дубоўка глыбока асэнсоўвае

Уладзімір Дубоўка з жонкай Марыяй Клаўс

ідэю адраджэння Бацькаўшчыны, выяўляе сваё бачанне шляхоў захавання духоўнай спадчыны беларусаў, адмоўна ставіцца да гвалтоўнай калектывізацыі. Паэт пастаянна дэманструе ўрэчаісненасць мастацкай канвы сваіх твораў, якія поўняцца ўмоўна-асацыятыўнай вобразнасцю.

Звернем увагу й на тое, што Уладзімір Дубоўка надзвычай актыўна прыўносіў лексіку з гаворак Пастаўшчыны й Мядзельшчыны ў свае творы. Часта ў іх сустракаюцца словы: "адляйцаць", "ажыргаць", "астрыжонак", "брыж", "буталь", "водзыўкі", "зблоціць", "калюжа", "лактаць", "нажутка", "пагурачак", "разыгранка"… Дзякуючы Дубоўку ў нашай мове прыжыліся словы: "агораць", "апантаны", "ашчаперыць", "водар", "дойлід", "збочыць", "зьнічка", "імклівасьць", "наканаваны", "нелюдзь", "непрыдатны", "талака", "удубальт"… Да таго іх не было ў творах літаратуры. Які паэтычны твор Дубоўкі з 20-х ні возьмеш — абавязкова кінецца ў вочы арыгінальная лексіка: "дэсань", "кунежыць", "сэймаваць", "сэймікаваць", "сквіл", "многакраць", "замета", "чмары", "гэрцы", "скелз", "валотны", "соўкаць", "стацьцё", "сухазлоты", "памжа", "вілаводны", "віратлівы", "цьвятлівіць", "заістужыць", "распарасонся", "бесхацінцы", "дзеньдзівер", "скогат", "сукрыстасць"...

Да таго ж у былога вяскоўца меўся ўласны праект вырашэння некаторых пытанняў графікі й правапісу беларускай мовы. Уладзімір Дубоўка пры тым улічваў досвед ужывання альфабэту (алфавіту) у сусветным культурна-моўным ландшафце. Ён сістэмна вывучаў выкарыстанне глаголіцы, кірыліцы, "грамадзянкі" ў беларускім кнігапісанні. Галоўная выснова Уладзіміра Мікалаевіча гучала так: "Сучасная наша кірыліца непапраўна лепш прыстасавана да нашае фонэтыкі, чымся польска-чэскі альфабэт". І вось як выглядаў ягоны праект па напісанні літараў "дж" і "дз" у беларускім альфабэце:

	друкаваныя		рукапісныя	
	вялікія	малыя	вялікія	малыя
Дз	𝔇	𝔡	𝔇	𝔡
Дж	𝔊	𝔤	𝔊	𝔤

Ён і быў рэалізаваны ў часопісе "Узвышша" ў 1928–29 гадах, але да заканадаўчага замацавання такога правапісу справа не дайшла. Засталіся праектамі й дзве іншыя прапановы. Уладзімір Дубоўка лічыў мэтазгодным замяніць "ё" на "ö", запазычыць з украінскай графікі "ї" для перадачы спалучэння "йі".

У памяць пра Уладзіміра Дубоўку яго імя носіць Пастаўская дзіцячая бібліятэка. У юбілейны год яе супрацоўнікі ладзяць літаратурныя сустрэчы, музычныя імпрэзы, кніжныя выставы, акцыі. У часе літсустрэчы "Жыццё маё — ці васілёк, ці ружа" дзяўчаты ў нацыянальных строях дарылі людзям галінкі шыпшыны й буклеты з вершамі творцы. Бібліятэка ж прадставіла шэраг матэрыялаў пра земляка, калі ствараўся раздзел, прысвечаны Уладзіміру Дубоўку, на партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: да 120-й яго гадавіны.

А два гады таму ладзіўся з Пастаў велапрабег "Хацелася пабыць ля Доўжа". Маршрут пралягаў праз родныя вёскі паэта Манькавічы ды Агароднікі, завяршыўся ля возера Доўжа, якое Уладзімір Дубоўка згадваў у вершах: "…А колькі дзе б ні вандраваў,/ Хоць добра ўсюды і прыгожа,/ Мяне цягнула да Пастаў,/ Хацелася пабыць ля Доўжа./ У Айчыне многа гарадоў,/ І вёсак — незлічоны шэраг./ А ўсё ж адсюль я ў свет пайшоў,/ І тут ён, гэты самы бераг..."

Міхаіл Стралец,
доктар гістарычных навук,
г. Брэст

Ад рэдакцыі. Некаторую інфармацыю пра вядомага земляка нам даслаў з Пастаўшчыны краязнаўца Ігар Пракаповіч. З яе вынікае: у даведніках савецкага часу прыхоўваліся весткі пра тое, што Уладзімір Дубоўка быў рэпрэсаваны. Пасля рэабілітацыі падавалі прыкладна такі тэкст: "Закончыў Нова-Вілейскую настаўніцкую семінарыю. Настаўнічаў у Тульскай вобласці, служыў у Чырвонай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у Маскве (рэдактарам, адказным сакратаром Пастаяннага прадстаўніцтва БССР пры ўрадзе СССР, выкладчыкам Камуністычнага ўніверсітэта народаў Захаду). Закончыў Вышэйшы літаратурна-мастацкі інстытут імя Валерыя Брусава. Быў членам літаб'яднанняў "Маладняк", "Узвышша". У 1930 годзе рэпрэсаваны. Зняволенне, высылку адбываў у Кіраўскай вобласці, Чувашыі, на Далёкім Усходзе, у Грузіі, Краснаярскім краі. Пасля рэабілітацыі (1957) жыў у Маскве, тады ж наведаў і Беларусь. Вёў перапіску з вучнямі й настаўнікамі Манькавіцкай школы. Памёр 20 лютага 1976 года, пахаваны ў Маскве".

Варта яшчэ нагадаць, што Уладзімір Дубоўка — аўтар зборнікаў вершаў "Строма", "Трысцё", "Credo", "Наля", "Палеская рапсодыя" (1961 — за кнігу атрымаў Літаратурную прэмію імя Янкі Купалы) ды іншых. Напісаў аповесці для дзяцей "Жоўтая акацыя", "Ганна Алелька", "Як Алік у тайзе заблудзіўся", кнігі вершаваных казак. Пераклаў творы У. Шэкспіра, Дж. Байрана, В. Брусава, П. Тычыны ды іншых паэтаў. Пабачылі свет яго Выбраныя творы ў 2-х тамах (1959, 1965). У кнізе ўспамінаў "Пялёсткі" (1973) апісаў эпізоды свайго маленства на Пастаўшчыне — у Агародніках ды Манькавічах.

Пра жыццёвы й творчы шлях Уладзіміра Дубоўкі можна пачытаць у кнізе Алеся Пашкевіча "Круг", Ігара Пракаповіча ды Ірыны Заяц "О Беларусь, мая шыпшына...".

У 1996 і 1999 гадах у Пастаўскім раёне (в. Дзеравянкі) праводзіліся літаратурныя фестывалі "Даўжанскія вечары", прысвечаныя творчасці Уладзіміра Дубоўкі.

ВАХТА ПАМЯЦІ

У новай зале — прэзентацыя

Прэзентацыя "Книги Памяти. Латвия" стала першай імпрэзай у новай зале Беларускага дома Ліепаі

У Беларускай грамады "Мара" добрая навіна: у нашым Беларускім доме адчынілася новая ўтульная зала. І там 10 ліпеня прайшла прэзентацыя "Книги Памяти. Латвия". На яе прыйшлі Генконсул Расіі ў Ліепаі Аляксей Беланосаў і консул Дзмітрый Багданаў, дэпутат Ліепайскай думы Людміла Разанава, госць з Літвы Вячаслаў Кастроў (узначальвае савет ветэранаў Вільнюскага вышэйшага каманднага вучылішча радыёэлектронікі: ВРТУ — ВВКУРЭ), прадстаўнікі грамадскасці горада.

Імпрэзу вёў старшыня Ліепайскага таварыства ваенных пенсіянераў Рамазан Назараў, які згадаў вядомыя словы Сяргея Ясеніна: "Большое видится на расстояньи". Далей казаў, што жыццё пацвярджае іх праўдзівасць, і чым больш мы аддаляемся ад вайны, тым больш усведамляем, якую страшную бяду знішчыла чалавецтва, перамогшы гітлераўскі фашызм, і якую вялікую цану пераможцы заплацілі за Перамогу. Аляксей Беланосаў выказаў падзяку пошукавікам і складальнікам кнігі.

Ад беларускай суполкі "Мара" ўсіх віталі старшыня Віктар Янцэвіч і актывіст Юры Хадаровіч. Яны гаварылі пра значнасць кнігі, якая адлюстроўвае сапраўдную гісторыю і ўвекавечвае месцы пахаванняў у тым ліку й землякоў-беларусаў. "Кніга дапамагае ўбачыць сапраўдныя падзеі, што адбываліся на самой справе. Вельмі важна пра тое казаць, памятаць, шанаваць памяць герояў і, вядома ж, нешта рабіць, каб яна зберагалася",— адзначыў Юры Хадаровіч.

ІГАР БАБРОЎ

На прэзентацыі ў новай зале Беларускага дома Ліепаі

Выступоўцы дзякавалі беларусам за цёплы і ўтульны прыём. Выказвалі надзею на далейшую супрацу, новыя імпрэзы ў Беларускім доме.

Анжэла Фаміна, г. Ліепая

"Голас Радзімы": 65 гадоў!

Чытайце газету ў інтэрнэце на партале zviazda.by

Падпісацца на газету "Голас Радзімы" можна ў паштовых аддзяленнях Беларусі

© "Голас Радзімы", 2020

Заснавальнік: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Выдавецкі дом «Звязда»"
Галоўны рэдактар Іван ЖДАНОВІЧ
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Пакой 907.
E-mail: golas_radzimy@tut.by
Тэлефон: + 375-17-2871526
Рэдакцыйнае пасведчанне №61. Выдадзена 16.07.2018 года Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Выдавецкі дом «Звязда»". Дырэктар – галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ
Аб'ём выдання: 2 друк. арк.
Падпісана да друку: 14.08.2020 г.
Наклад 373.
Заказ – 1143.
Выходзіць 2 разы на месяц
Месца друкавання: Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»" ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004 Пр-т Незалежнасці, 79/1. 220013, Мінск, Рэспубліка Беларусь

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца й не рэцэнзуюцца. Пазіцыі рэдакцыі ды аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.